## Абітурыент-2016

# ЗДАЦЬ ЦТ У РЭЗЕРВОВЫ ДЗЕНЬ...

**Рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні ў рэзервовы дзень будзе весціся з 28 чэрвеня па 1 ліпеня. З сабой трэба мець пропуск на тэсціраванне, якое было прапушчана, дакумент, які сведчыць асобу абітурыента, і дакумент, які пацвярджае ўважлівую прычыну няяўкі.**

Арганізатары ЦТ папярэджваюць: да здачы тэст-іспытаў у рэзервовы дзень будуць дапушчаны толькі тыя абітурыенты, якія змогуць даказаць, што ў іх былі сур'ёзныя прычыны для пропуску экзамену (напрыклад, прад'явіць даведку пра сваю хваробу). Калі абітурыенты ўдзельнічалі ў ЦТ у асноўны дзень, але не змаглі дапісаць сваю работу з-за пагаршэння стану здароўя, яны таксама змогуць скарыстацца рэзервовым днём. Для аказання абітурыентам медыцынскай дапамогі ва ўсіх пунктах правядзення тэсціравання былі арганізаваныя дзяжурствы медыцынскіх работнікаў, таму такія выпадкі фіксаваліся непасрэдна на месцы. А вось тыя, хто парушыў правілы ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, здаць прапушчаны экзамен у рэзервовы дзень не змогуць.

Звяртацца з дакументамі, якія пацвярджаюць прычыну няяўкі на ЦТ, трэба ў Белдзяржуніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт і Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт.

Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсіх вучэбных дысцыплінах у рэзервовы дзень вызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, але здаць 5 ліпеня можна будзе толькі адну вучэбную дысцыпліну. Таму калі абітурыент прапусціў два экзамены, шанцы выправіць сітуацыю і паўдзельнічаць у конкурсным адборы ў яго роўныя нулю.

Між іншым, як запэўнівае **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў,** колькасць тых, хто прапускае цэнтралізаванае тэсціраванне, з года ў год не змяняецца. Скажам, сёлета на ЦТ па беларускай мове зарэгістраваліся 22 348 абітурыентаў, а не прыйшлі на экзамен 631, гэта складае 3,8% ад агульнай колькасці. Рускую мову павінны былі здаваць больш як 78 тысяч чалавек, але да пунктаў правядзення тэсціравання так і не дайшлі больш як 2100 чалавек. Ад агульнай колькасці гэта тыя ж 3,8%. На тэсціраванне па матэматыцы не прыйшлі 4,5% з тых, хто аформіў сабе пропуск (летась іх было 4,9 працэнта).

У наступным годзе, пасля зацвярджэння новых Правілаў прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, колькасць рэзервовых дзён абяцаюць павялічыць, каб за бортам прыёмнай кампаніі не засталіся абітурыенты, для якіх абставіны ў чэрвені склаліся не самым лепшым чынам.

Разам з тым назіраецца цікавая тэндэнцыя: з абітурыентаў, якім удалося даказаць сваё права скарыстацца рэзервовым днём, кожны год усё роўна далёка не ўсе даходзяць да пункта правядзення экзамену. І знайсці гэтаму тлумачэнне арганізатары ЦТ не могуць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Трагедыя

# КАВАРНАЯ СЦВІГА ЗАБРАЛА ТРОХ ХЛОПЦАЎ

**Двух сыноў адразу страціла сям'я з аграгарадка Дзяржынск Лельчыцкага раёна. Разам з імі патануў і іх сябар-аднавясковец. Целы трох юнакоў знойдзены ў рацэ Сцвіга. Цяпер раённы аддзел Следчага камітэта праводзіць праверку па факце гібелі людзей.**

Вёска знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці ад тэрыторыі Украіны і Брэсцкай вобласці. У другой палове дня 25 чэрвеня два родныя браты 18 і 15 гадоў разам з 15-гадовым аднавяскоўцам на двух матацыклах паехалі лавіць рыбу ў суседні Столінскі раён — гэта 3,5 кіламетра ад іх месца жыхарства. Калі вечарам дзеці не вярнуліся дадому, родныя забілі трывогу. Да пошукаў юных рыбакоў далучыліся аднавяскоўцы і асабовы склад памежнай заставы «Дзяржынск».

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта па Гомельскай вобласці Марыя Крыванагава, падчас агляду месца здарэння, а таксама целаў загінулых, не знойдзена прыкмет, якія паказваюць на здзяйсненне ў адносінах да іх супрацьпраўных дзеянняў.

Рэчка Сцвіга быццам бы зусім вузенькая і неглыбокая: у некаторых месцах ледзь вышэй за калена. Але ж у асобных — сустракаюцца нечаканыя яміны. Менавіта ў такую, глыбіней 2,5 метра, і трапілі юнакі. Загінулыя знаходзіліся ў рабочай адзежы і абутку. Гэта дае падставы выказаць здагадку, што хтосьці пачаў тануць, а астатнія кінуліся на дапамогу. За 100 метраў ніжэй па плыні ракі знойдзены брадні, сумка для рыбы і чыстае адзенне. Нідзе не знойдзена слядоў ад вогнішча ці пікніка.

Вядома, што 15-гадовыя падлеткі толькі закончылі вучобу ў мясцовай базавай школе, а 18-гадовы хлопец быў навучэнцам Бабруйскага дзяржаўнага механіка-тэхналагічнага каледжа. Ні дзеці, ні іх бацькі да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці не прыцягваліся і не былі заўважаны ва ўжыванні спіртных напояў. Для вызначэння дакладнай прычыны смерці прызначаны судова-медыцынскія экспертызы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## Дзеля памяці

# ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГНЕЦЦА... ЗА ЗАСЛОНАЙ

**Сёння Беларусь развітваецца са сваімі народнымі артыстамі Расціславам ЯНКОЎСКІМ і Сяргеем КАРТЭСАМ**





У адзін дзень дзве страты: народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі пайшоў з жыцця на 87-м годзе. Сяргею Картэсу быў 81 год.

Янкоўскі усё жыццё служыў у драматычным тэатры і здымаўся ў кіно. Сяргей Картэс як кампазітар узбагачаў музычную культуру і ўзняў айчыннае опернае мастацтва, калі ўзначальваў оперную трупу ў Вялікім тэатры Беларусі.

Яшчэ нядаўна народнага артыста СССР Расціслава Іванавіча Янкоўскага як асобу ў тэатры адзначылі ўзнагародай у рамках нацыянальнай тэатральнай прэміі Расіі «Залатая маска». Ён не здолеў яе атрымаць асабіста. Але на сцэне іграў, колькі мог. Пакуль мог — іграў. Амаль усё сваё творчае жыццё аддаў любімаму Нацыянальнаму акадэмічнаму драматычнаму тэатру імя М. Горкага, дзе служыў з 1957 года да апошніх дзён. Менавіта ў гэтым тэатры — на Вялікай сцэне — сёння адбудзецца развітанне з любімым артыстам, з паважаным чалавекам.

Але яго героі і вобразы застануцца як у тэатры, так і ў кіно, дзе найстарэйшы прадстаўнік славутай творчай дынастыі Янкоўскіх таксама працаваў шмат, да таго ж пятнаццаць гадоў быў старшынёй Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», яго імя і асоба прыцягвалі ў сталіцу Беларусі шмат вядомых артыстаў і рэжысёраў... Медаль і ордэн Францыска Скарыны сярод шматлікіх узнагарод Расціслава Янкоўскага ўспрымаюцца сімваламі служэння айчыннай культуры.

Гэта ж рабіў усё жыццё і Сяргей Альбертавіч Картэс. Беларускі творца па волі лёсу (сям'ю эмігрантаў з Аргенціны ў 1955 годзе накіравалі ў Мінск). Можа, з-за таго, што бацька Сяргея Картэса быў чылійцам, і сам ён пачынаў вучыцца музыцы ў Аргенціне, яго музычная творчасць вельмі адметная. Прытым што прафесійную музычную адукацыю ён атрымліваў ужо ў Беларускай кансерваторыі. Стаў беларускім кампазітарам: стварыў араторыі на словы Купалы, вакальныя цыклы на вершы беларускіх паэтаў Вярцінскага, Танка. У 1999 годзе атрымаў званне народнага артыста Беларусі.

Яму ўдалося ў сваёй асобе спалучыць розныя культурныя традыцыі і праз музыку весці гаворку пра агульначалавечае, тое, што рухае народамі, даючы энергію развіцця...

Сувязяў з тэатрам Сяргей Картэс не губляў: яму як аднаму са шматгадовых кіраўнікоў беларускай оперы было важна, каб цікавасць да яе не згасала не толькі ў сваёй краіне. Клопат Сяргея Альбертавіча пра развіццё менавіта беларускай оперы адлюстраваўся ў яго марах, напрыклад, бачыць на сцэне «Ладдзю роспачы» паводле Караткевіча: варты сур'ёзнай музыкі твор, які прыадкрывае заслону вечнасці... Правесці кампазітара ў вечнасць можна сёння ў рытуальнай зале Рэспубліканскага клінічнага медыцынскага цэнтра.

Спачуванні родным з нагоды сыходу таленавітых Асоб Беларусі выказаў Прэзідэнт краіны.

**Калектыў нашай рэдакцыі смуткуе з нагоды страты артыстаў, чыя творчасць стала народнай і працягне такой заставацца: іх унёсак у развіццё тэатральнага і музычнага мастацтва мы ўспомнім, калі адкрыецца заслона спектакляў, да якіх яны мелі дачыненне.**

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю народнага артыста Беларусі Сяргея Альбертавіча КАРТЭСА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю народнага артыста СССР Расціслава Іванавіча ЯНКОЎСКАГА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

# ГАЛОЎНАЕ ШЭСЦЕ КРАІНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Для нясення штандараў падбіраюцца фізічна развітыя юнакі: штандар важыць больш як 30 кілаграмаў, часам дзьме моцны вецер і каб пранесці яго, патрабуецца вялікая намаганні, — тлумачыць **камандзір зводнай роты ганаровай варты Павел ШПАРЛА.** — Увогуле салдаты і афіцэры ўжо гатовы да выканання пастаўленай задачы. Засталося дапрацаваць дробныя элементы. Сёлета ў пляц-канцэрце мы выкарысталі найбольш яркія і відовішчныя моманты, якія падабаюцца гледачам. Будучы у нашым выступленні, якое, дарэчы, пройдзе пад прынцыпова новае музычнае суправаджэнне зводнага ваеннага аркестра, і новыя элементы.

Паўдзельнічаць у ваенным парадзе выпаў гонар і курсантам Ваеннай акадэміі Беларусі, ваенна-тэхнічнага факультэта БНТУ, вайскоўцам 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады, 38-й і 103-й асобных гвардзейскіх мабільных брыгад, 85-й і 86-й брыгад сувязі, 56-га, 60-га і 74-га асобных палкоў сувязі. У складзе пешай калоны таксама пройдуць разлікі Дзяржаўнага памежнага камітэта, унутраных войск Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Усяго — каля 20 парадных разлікаў.

Для гвардыі радавога 103-й асобнай гвардзейскай мабільнай брыгады Рыгора Капылова гэта першы парад. «Рыхтуючыся да парада, я адчуваю пачуццё вялікай адказнасці і абавязку, — гаворыць гвардзеец. — Парад — гэта яшчэ і своеасаблівая даніна прадкам. Мой дзядуля ваяваў. Ад бацькі ведаю толькі, што дзед зусім крыху не дайшоў да Берліна, атрымаў раненне і трапіў у канцлагер. Калі ён жыў, я быў зусім маленькім. І, вядома, тады яго ваенная біяграфія мяне не надта цікавіла, бо я яшчэ мала што разумеў пра вайну. Калі б быў старэйшым, распытаў бы больш...»

Як расказаў Рыгор Капылоў, у сталіцы гвардзейцы з Віцебска жывуць больш за месяц. Сумесныя трэніроўкі пачаліся ўжо ў маі. За гэты час вайскоўцы з розных часцей паспелі не толькі пасябраваць, а і больш пазнаёміцца з ваеннай гісторыяй краіны. Для іх былі арганізаваны экскурсіі ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, на Лінію Сталіна, у музей касманаўтыкі, што на аэрадроме «Баравая», наведалі юнакі і Драматычны тэатр беларускай арміі.

Што будзе ўяўляць сабой на сёлетнім парадзе механізаваная калона, мы пісалі раней. Нагадаем, яе агульная працягласць складзе больш як два кіламетры. Перад трыбунамі пройдзе больш за 160 адзінак баявой тэхнікі. Асядлаюць «жалезных коней» прыкладна 430 вайскоўцаў. Прычым мінчане і госці сталіцы ўбачаць як асноўныя ўзоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі сучаснай арміі, так і рарытэты перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

— Механізаваныя парадныя разлікі ўжо завяршылі падрыхтоўку, цяпер ажыццяўляецца афарбоўка тэхнікі, асабовы склад працуе над сваім знешнім выглядам, — рэзюмуе **камандуючы парадам войск Мінскага гарнізона, намеснік міністра абароны генерал-маёр Сяргей ПАТАПЕНКА.** — Пешыя парадныя разлікі працягваюць трэніравацца. Падрыхтоўка да парада з'яўляецца этапам баявой падрыхтоўкі ваеннаслужачых. Тут



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

удасканальваецца зладжанасць падраздзяленняў, практычныя навыкі кіроўцаў і механікаў-кіроўцаў у авалоданні штатнай тэхнікай і ўзбраеннем. У парадзе прымуць удзел узоры мадэрнізаванай і новай закупленай тэхнікі. Напрыклад, рэактыўныя сістэмы залпавага агню «Паланэз» адразу пасля выпрабаванняў станучь у строй і пройдуць у парадным разліку.

Упрыгажэннем ваеннага парада стане паветраны эшалон. Асноўныя тыпы авіяцыйнай тэхнікі, якія стаяць на ўзбраенні Ваенна-паветраных сіл Беларусі, а таксама некалькі самалётаў Расійскай Федэрацыі можна будзе ўбачыць у адзін дзень ды ў адным месцы — у небе над Мінскам.

Тым, у каго іншыя планы на 3 ліпеня, ёсць магчымасць папрысутнічаць на генеральных рэпетыцыях парада, якія пройдуць 25 і 28 чэрвеня каля абеліска «Мінск — горад-герой».

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*